6. *Ши Айхуа.* Об особенностях здравоохранения этноса туцзя / Ши Айхуа // Китайская народная медицина. – 2007. – № 6. – С. 373–374. – На кит. яз.: 石爱华，«试述土家族人的养生保健特点»,«中国民族民间医药», 2007 (6). –页 373–374.
7. *Юань Тиндун.* История культуры Башу / Юань Тиндун. – Чэнду : Изд-во Башу, 2009. – С. 95–96. – На кит. яз.: 袁庭栋. «巴蜀文化志», 成都市 : «巴蜀书社», 2009. – 页 95–96.

***Д. А. Мардань,***
***Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маяк»,***
***г. Мінск***

# БЕЛАРУСКАЯ РАСЛІННАСЦЬ ЯК ЧАСТКА КУПАЛЬСКАЙ АБРАДНАСЦІ

Адным з галоўных свят беларускага народнага календара лічыцца Купалле, абраднасць якога прасякнута выразнымі вобразамі і сімваламі. Галоўная ідэя свята – гэта ўзаемадзеянне ўдзельнікаў свята і яднанне са стыхіямі прыроды – зямлёй (у тым ліку з флорай), вадой, агнём, паветрам. Расійскія абрадазнаўцы Л. Вінаградава і С. Талстая ў складаным комплексе купальскіх рытуалаў і вераванняў усіх еўрапейскіх, у тым ліку і славянскіх народаў, вылучаюць: збор траў і кветак, упрыгожванне зелянінай дамоў і гаспадарчых збудаванняў, людзей, жывёлы; хаджэнне да вады, купанне, абліванне вадой, пусканне па вадзе вянкоў і траў; падпальванне вогнішчаў, танцы, пераскокванне праз агонь, сімвалічнае знішчэнне нячыстай сілы і г. д.; высочванне і адпужванне ведзьмы; начныя бясчынствы; павер'і пра «ігру сонца» і іншых з'яў прыроды [1].

Збор раслін напярэдадні або ў дзень летняга сонцастаяння адзін з устойлівых агульнаславянскіх элементаў купальскай абраднасці, які знайшоў адлюстраванне ў народных назвах свята: беларускай – «Іван-Траўнік», «Іван Каляровы», украінскай – «Іван Цвятошын», «Іван Лапушнік»; балгарскай – «Иван Бильоберъ», сербскай – «Јован Биљобер», «Јовап Метлар» і г. д. Па тым значэнні, якое займаюць у гэтым свяце расліны, і па спосабах іх абрадавага ўжывання, Купалле падобна першым чынам з Тройцай, для якой рытуалы, звязаныя з зелянінай, з'яўляюцца галоўнымі. Аб звычаях пляцення вянкоў і апя-

рэзванні палыном у Іванаў дзень захавалася мноства сярэдневяковых сведчанняў. Па дадзеных польскіх даследчыкаў XVI ст., абвязваць сябе палыном у дзень Святога Яна рэкамендавалася і мужчынам, і жанчынам. Гэтай жа раслінай абвязвалі ссечанае дрэўца (жэрдку), прызначанае для спальвання на вогнішчы; упрыгожвалі хаты і абкурвалі пабудовы для «выдалення нячыстай сілы і псуты». Народны звычай насіць пры сабе палын як абярэг ад русалак і ведзьмаў заставаўся шырока распаўсюджаным ва ўкраінска-беларускай і заходнеславянскай абраднасці да пачатку XX ст.

У шэрагу месцаў выхад за зелянінай раніцай быў асаблівым чынам рытуалізаваны. У Балгарыі групу моладзі ўзначальвала вопытная жанчына. *Пры зборы траў выконваліся спецыяльныя абрадавыя песні.* З сабраных траў адразу ў полі плялі вялікі вянок, праз які пралазілі па чарзе ўдзельнікі абраду, каб быць здаровымі ўвесь год. Акрамя таго, плялі маленькія вяночкі і букецікі, якія захоўвалі на выпадак хвароб. Адпраўляліся за травой у Іванаў дзень да ўзыходу сонца, бо, па павер'ях, гаючыя ўласцівасці захоўваюць толькі тыя расліны, якія не паспее асвятліць сонца [4, с. 73].

Збіралі не толькі лячэбныя травы, але і расліны-абярэгі (крапіву, палын, галінкі калючых хмызнякоў), а таксама травы і кветкі, прызначаныя для варажбы, абрадавых вянкоў і букецікаў, расліны для вырабу венікаў, мяцёлак, кошыкаў. Лепшым перыядам збору траў лічылі час напярэдадні Купалля. Існуе павер'е, што ўсю траву трэба збіраць толькі да Святога Яна, таму што пазней ведзьмы аплююць іх, і расліны страцяць сілу. У кожнай мясцовасці быў вядомы адмысловы набор так званай іванаўскай травы, якую трэба было збіраць менавіта на Купалле. Некаторыя славянскія павер'і адзначаюць сувязь іванаўскіх траў з міфічнымі істотамі і нячыстай сілай (напрыклад, з русалкамі, духамі хвароб і г. д.).

Па дадзеных украінскіх даследчыкаў, гаючыя травы вырошчваюць русалкі і маўкі, якія ведаюць іх лячэбныя ўласцівасці.

У Балгарыі верылі, што кожная з хвароб валодае «сваёй» раслінай, здольнай гэтую ж хваробу вылечыць, і што адзін раз у годзе (у Іванаў дзень) усе хваробатворныя духі збіраюцца

разам сярод квітнеючых раслін, таму людзі шукаюць адмысловую траву, каб пазбавіць ад хвароб і немачы.

Асноўнае абрадавае выкарыстанне купальскай зяляніны звязана са звычаем затыкаць галінкі і травы за вокны і дзверы, пад дах, у шчыліны хат і ўсіх гаспадарчых пабудоў, упрыгожваць ёю жыллё знутры. Людзі таксама насілі вянкі, прымацоўвалі кветкі і букеты да адзення, накручвалі зяляніну на рогі каровам. Такія дзеянні матываваліся часцей за ўсё імкненнем абараніць сябе, дамы, жывёлу ад ведзьмаў, русалак, духаў хвароб і іншай нячыстай сілы. У некаторых месцах вянкі з «іванаўскай» травы адносілі на могілкі і вешалі на магільныя крыжы.

У лужычан было прынята падвешваць у хаце сплецены з 9 відаў раслін вянок, які пакідалі на працягу года да наступнага Іванава дня. Травы з яго бралі для лячэння хвароб. Пасля завяршэння свята Івана Купалы выкарыстаную ў абрадах зяляніну спальвалі або пазбаўляліся ад яе падчас варажбы: кідалі вянкі і букеты ў ваду, закідвалі на дахі дамоў, дрэвы, агарод і поле г. д. Гуцулы Закарпацця сабраную папараць зносілі ў кучу і закідвалі камянямі, альбо збівалі палкамі, гэты звычай называўся «біць папараць». Адмысловае адрозненне *папараці* сярод іншых раслін тлумачыцца тым, што яна лічылася аднначасова д’ябальскім і цудоўным зеллем. У некаторых месцах, наадварот, папараць была галоўнай у шэрагу раслін: вялікія пучкі папараці падвешвалі ў хляве супраць ведзьмаў (Гомельская вобласць); на Гродзеншчыне адна з назваў Купалля – *Папараць-дзень*. Актыўна выкарыстоўвалася расліна ў купальскай абраднасці Славеніі. Ва ўсіх славян вядомыя павер’і аб вядзьмарскіх уласцівасцях квітнеючай уначы папараці, якая з’яўляецца яшчэ адным раслінным сімвалам свята [4, с. 155].

Вялікая колькасць тэкстаў купальскіх песень пацвярджаюць ролю расліннасці ў купальскай абраднасці:

*«Перад Пятром пятым днём*
*Дзеўкі зёлкі збіралі.*
*Дзеўкі зёлкі збіралі.*
*Да караля паслалі.*
*Кароль зёлак не пазнаў,*
*Каралеўне адаслаў...» [3, с. 20].*

Песні, што суправаджалі збор зёлак, складаюць *у беларускай спеўнай традыцыі* асобную шматлікую групу:

*«Сёння Купалка, а заўтра Ян,*
*Пойдзем, дзявочкі, у кяточкі,*
*Пойдзем, дзявочкі, у кяточкі,*
*Ды паўём мы сабе вяночкі…» [Там жа, с. 21];*

*«Да сёння Купало, заўтро Ян,*
*Да паёдзём, дзяўчата, ў зялёный гай.*
*Да пайдзём, дзяўчата, ў гаёчак,*
*Да нарвём, дзяўчата, кветачак» і г. д. [Там жа, с. 22].*

Купальскае збіранне «зёлак-красак» наскрозь прасякнута сімволікай найвышэйшага ўздыму рэпрадуктыўных сіл прыроды, характэрнага для «біяэнергетычнага поля» купальскіх дзён і начэй. Да гэтага ж сімвалічнага шэрагу дапасуюцца пошукі вогненнай кветкі. Гэта беларуская *папараць* і *paparatis* у балтыйскай традыцыі, як лічаць літоўцы, сімвал агню Perkūnas'а.

Такім чынам, у купальскай абраднасці прадстаўлена вялікая колькасць раслін: папараць, лекавыя зелкі, з якіх гатавалі купальскія напоі і выконвалі лекавыя, магічныя функцыі.

1. *Виноградова, Л. Н.* Иван Купала / Л. Н. Виноградова, С. М. Толстая // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М. : Междунар. отношения, 1995–2012. – Т. 2. – 1999. – С. 363.

2. *Гуд, П. А.* Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – 2-е выд., стэр. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 137 с.

3. Купальскі спеўнік : метад. дапам. / аўтар-укл. Т. А. Пладунова. – Мінск : Ін-т культуры Беларусі, 2013. – 160 с.

4. *Соколова, В. К.* Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. XIX – начало XX в. / В. К. Соколова. – М. : Наука, 1979. – 293 с.